# [У Віцебску прайшло выязное пасяджэнне калегіі Мінсувязі]

20 красавіка 2018 года на базе Віцебскага філіяла РУП «Белтэлекам» адбылося пасяджэнне калегіі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь. Тэма пасяджэння: «Аб эфектыўнасці выкарыстання аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. Аб рабоце кіраўнікоў арганізацый сістэмы Мінсувязі па забеспячэнню культуры вытворчасці і стварэнню неабходных санітарна-бытавых умоў працуючых ".

У пасяджэнні прынялі ўдзел кіраўнікі арганізацый сістэмы Мінсувязі і мабільных аператараў, старшыня Беларускага прафесійнага саюза работнікаў сувязі, кіраўнікі філіялаў, размешчаных у г.Віцебску, старшыні пярвічных прафсаюзных арганізацый.

Дакладчыкамі адзначана, што арганізацыі сістэмы Мінсувязі на пастаяннай аснове праводзяць работу па павышэнню эфектыўнасці выкарыстання аб'ектаў сацыяльнай сферы, па забеспячэнню культуры вытворчасці і стварэнню неабходных санітарна-бытавых умоў працуючых. Так, у цяперашні час у арганізацыях сістэмы Мінсувязі функцыянуюць 2 базы адпачынку, 1 аздараўленчы лагер, 4 гісторыка-інфармацыйныя цэнтры, 3 клуба сувязі, 7 сталовых, 6 буфетаў, 13 пунктаў аховы здароўя, 13 інтэрнатаў, 1 жылы дом, 10 кватэр.

Матэрыяльна-тэхнічная база аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры абнаўляецца, мадэрнізуецца, своечасова праводзіцца бягучы рамонт памяшканняў. Аб'екты знаходзяцца ў здавальняючым стане і эксплуатуюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі нормаў і правілаў па ахове працы. Праводзіцца работа па пашырэнні спектру аказваемых паслуг, ўдасканаленні прапанаваных формаў аздараўлення і вольнага часу на базах адпачынку.

Акрамя таго, арганізацыямі арганізаваныя і абсталяваныя фізкультурна-аздараўленчыя аб'екты для заняткаў рознымі відамі спорту, абсталяваны актавыя залы для правядзення інфармацыйнай працы. Праводзіцца мэтанакіраваная фізкультурна-аздараўленчая і спартыўна-масавая работа. Штогод арганізоўваюцца турыстычныя злёты, матчавыя сустрэчы, турніры, у клубах сувязі працуюць гурткі і калектывы мастацкай самадзейнасці.

У рамках правядзення пасяджэння ўдзельнікі наведалі Віцебскі філіял УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія сувязі". Дырэктар філіяла Сяргей Шыбека і выкладчыкі праінфармавалі аб дзейнасці ўстановы адукацыі ў галіне развіцця сацыяльнай інфраструктуры для навучэнцаў. Усе змаглі азнаёміцца з матэрыяльна-тэхнічнай базай установы, наведаўшы навучальныя цэнтры Белтэлекам, Паштовай сувязі, HUAWEI, ZTE, навучальны цэнтр па вывучэнні інфармацыйных тэхналогій асобамі з аслабленым слыхам, электронную бібліятэку і іншыя навучальныя кабінеты і лабараторыі.

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/23-04-2018-2973*